toKino — Беларуска - літоўскі фестываль небюджэтнага кіно — Baltarusių ir lietuvių nebiudžetinio kino festivalis — toKino

## Беларуска-літоўскі фестываль небюджэтнага кіно "toKino"

**Час:** 28 траўня - 1 чэрвеня 2013 г.

**Месца:** Вільня (Літва)

**Ідэя фестываля:**

"toKino" уяўляе сабой адкрытую прастору выказвання і абмену досведам маладымі аўтарамі з Беларусі і Літвы, якія шукаюць альтэрнатыўныя шляхі маўлення на важныя для іх тэмы і/або выкарыстоўваюць кіно ды відэа як інструменты сацыяльнага дзеяння.

"toKino" - гэта фестываль небюджэтных фільмаў, створаных на сродкі аўтараў або ў рамках кінаклубаў, некамерцыйных і неінстытуцыяналізаваных праектаў.

"toKino" - гэта сустрэча аўтараў, даследчыкаў і актывістаў, пляцоўкай для дыскусіі якіх стануць варштаты, лекцыі, публічныя прагляды і прэзентацыі ў рамках фестывальнага тыдня.

Адзін з фокусаў фестываля - дыскусія аб магчымасці выкарыстання кіно і відэа як інструментаў грамадзянскага дзеяння. Дзве секцыі "toKino" непасрэдна прысвечаныя фільмам, якія закранаюць пытанні гендарнай роўнасці, мабільнасці, сацыялізацыі і інтэграцыі людзей са спецыяльнымі патрэбамі, мігрантаў, прадстаўнікоў этнічных і рэлігійных суполак у Беларусі і Літве. Гэта секцыя *"Права гаварыць" (працоўная назва)*, заснавальнікам якой з'яўляецца партнёр фестываля Беларускі Дом правоў чалавека ў Вільні, і секцыя "Кіно без візы", заснаваная грамадзянскім рухам "БЕЗ ВІЗЫ!" (НДА “Belarus Watch“, Літва).

**Маніфест**

Мы разумеем кіно як даследаванне жыцця, як працэс зведвання і навучэння бачанню і маўленню. "toKino" - гэта кіно новых варункаў і выклікаў, як магчымасць прамаўляць тое, аб чым прынята маўчаць. Бачыць тое, на што баяцца глядзець. Рабіць тое, што лічаць немагчымым.

"toKino" гэта кіно ўзаема/дзеяння, пазіцыі і рэфлексіі.

Мы верым у магчымасць новае формы, якая паўстае на стыках сэнсаў, у шчарбінах і руху выслізання. Спосаб вырабу, спажывання і рэфлексіі медыя-выказванняў можа рэзка розніцца. І менавіта гэтае адрозненне здаецца нам найзначнейшым.

Ці з'яўляецца фільм грамадзянскім дзеяннем? Як звязаная культурніцкая вытворчасць і грамадзянскі актывізм, рухомыя карцінкі і сацыяльныя рухі? - мы запрашаем вас разам паразважаць над гэтымі і іншымі пытаннямі аб формах і функцыі кінематаграфічных выяў ды разнастайных стратэгіях іх стварэння.

**У праграме фэста:**

- конкурсныя паказы
- адмысловыя паказы
- майстар-класы
- адкрытыя лекцыі
- дыскусіі
- уручэнне дыпломаў і прызоў

toKino

**Умовы ўдзелу ў адкрытым конкурсе:**

Да ўдзелу ў агульным конкурсе запрашаюцца аўтары-грамадзяне Літвы і Беларусі, не старэйшыя за 30 гадоў. Грамадзяне іншых дзяржаў запрашаюцца да ўдзелу ў асобным конкурсе па асноўных намінацыях фестываля.

Да ўдзелу ў конкурсным адборы прымаюцца:

- *іграаvыя фільмы*

- *дакументальныя фільмы*

- *эксперыментальнае кіно* (відэаарт, мантажнае кіно, арт-дакументалістыка)

- *фільмы, знятыя на мабільныя тэлефоны.*

Работы павінны адпавядаць фармату фестываля: быць створаныя на сродкі аўтараў або ў рамках кінаклубаў, некамерцыйных і неінстытуцыяналізаваных праектаў не раней за 2010 год.

Працягласць работ не можа перавышаць 15 хвілін і 4 Гб, фільмы прымаюцца толькі ў фарматах - .avi, .mp2, .mp4. Работы павінны суправаджацца транскрыптам дыялогаў і/або закадравага тэксту. Архіў з фільмам, транскрыптам і заяўкай запампоўваецца на канал фестываля на wetransfer (гл. *Як запампаваць фільм*). *Калі фільм на канал wetransfer загрузіць немагчыма, аргкамітэт фестываля можа прапанаваць альтэрнатыўны варыянт.*

Папярэдні адбор работ ажыццяўляе аргкамітэт фестываля.

Фільмы, якія прайшлі папярэдні адбор, бяруць удзел у асноўным фестывальным конкурсе. Работы, адабраныя ў праграму фестывальнага конкурса, ацэньвае экспертнае журы. За найлепшыя работы прысуджаюцца прызы і дыпломы ў кожнай з фестывальных намінацый.

***Умовы ўдзелу ў секцыях* "Права гаварыць" *і* "Кіно без візы"**

Да ўдзелу ў конкурсе запрашаюцца аўтары-грамадзяне Літвы і Беларусі, не старэйшыя за 30 гадоў.

Да ўдзелу ў конкурсе ў секцыі *"Права гаварыць"* прымаюцца работы, прысвечаныя пытанням правоў чалавека ў Літве і Беларусі: роўнае грамадзянства, гендарная роўнасць, пытанні экалогіі, біяэтыкі.

Працягласць работ не можа перавышаць 5 хвілін, фільмы прымаюцца толькі ў фарматах – .avi, .mp2, .mp4. Работы павінны суправаджацца транскрыптам дыялогаў і/або закадравага тэксту. Архіў з фільмам, транскрыптам і заяўкай запампоўваецца на канал фестываля на wetransfer (гл. *Як запампаваць фільм*).

Да ўдзелу ў конкурсе ў секцыі *"Кіно без візы"* прымаюцца работы, тэматычна звязаныя з пытаннямі мабільнасці, візавага рэжыму паміж Беларуссю і Еўразвязам, досведам падарожжаў грамадзян Беларусі па Еўразвязе, а грамадзян Літвы - па Беларусі.

Працягласць работ не можа перавышаць 3 хвіліны, фільмы прымаюцца толькі ў фарматах – .avi, .mp2, .mp4. Работы павінны суправаджацца транскрыптам дыялогаў і/або закадравага тэксту. Архіў з фільмам, транскрыптам і заяўкай запампоўваецца на канал фестываля на wetransfer (гл. *Як запампаваць фільм*).

toKino

*На этапе конкурснага адбору аўтары павінны падаць:*

- запоўненую заяўку на ўдзел,

- фільм памерам да 4 Гб,

- файл у фармаце MS Word з тытрамі на мове арыгіналу (у выпадку расейскай, беларускай, літоўскай моў) або на ангельскай (неабходныя для перакладу тытраў на літоўскую / беларускую мовы).

Копіі фільмаў застаюцца ў архіве фестываля.

Запоўненая заяўка, фільм і файл з тытрамі запампоўваюцца ў архіўным файле на канал wetransfer фестываля: **tokino.wetransfer.com**

Апошні тэрмін падачы заявак і фільмаў: **01.05.2013.** Будзьце ўважлівыя, аргкамітэт фестываля павінен атрымаць поўны пакет матэрыялаў (запоўненая заяўка, файл з тытрамі і фільм) на канал **tokino.wetransfer.com**. Памер архіўнага файла мусіць не перавышаць 5Гб.

Аргкамітэт фестываля гарантуе, што фільмы, пададзеныя ўдзельнікамі конкурснага адбору, не будуць выкарыстоўвацца ў камерцыйных мэтах, за выключэннем фрагментаў працягласцю не больш як 1 хвіліна для рэкламы фестываля.

***Аўтыры фільмаў, што прайшлі конкурсны адбор, запрашаюцца да ўдзелу ў праграме фестываля. Аргкамітэт фестываля гарантуе візавую падтрымку і бярэ на сябе часткоўую кампенсацыю выдаткаў удзельнікаў на праезд і пражыванне падчас правядзення фестываля*.***

У рамках фестывальнага тыдня адбудзецца шэраг варштатаў, публічных лекцый і дыскусій з кінеметаграфістамі, даследчыкамі, відэаактывістамі з Літвы, Беларусі ды іншых краін. Акрамя паказаў конкурснай праграмы, адбудуцца публічныя прагляды кінафільмаў (адмысловыя паказы, выбар кінакрытыкаў і інш).

Уваход на ўсе мерапрыемствы фестываля "toKino" вольны.

Аргкамітэт фестываля: tokino@litpro.lt

**Старонка фестываля ў сеціве: www.tokino.lt**

Арганізатар фестываля: Праект **LitPro** (сацыяльна-культурніцкі праект ЕГУ па ўсталяванні міжкультурнага дыялогу паміж Літвой і Беларуссю) і Дэпартамент медыя ды камунікацыі Еўрапейскага гуманітарнага ўніверсітэта.

Фестываль ладзіцца пры падтрымцы:

Міністэрства замежных спраў Літвы

Фундацыі Дамоў правоў чалавека

Дома правоў чалавека ў Вільні

НДА "Belarus Watch"

Партнёры фестываля:

Арганізацыя "Meno Avilys"

Кінацэнтр "Skalvija"

Інфармацыйныя партнёры:

Мультымедыйны маладзёвы часопіс 34mag.net

Інфармацыйны партал 15min.lt;

Галерэя сучаснага мастацтва "Ў"

ДК “La Mora”

Кавярня "Зерно"

***** арганізатары кампенсуюць удзельнікам транспартныя выдаткі ў памеры да 30 еўра выключна па прадстаўленні арыгіналаў праязных дакументаў. Удзельнікам з Беларусі і Літвы гарантуецца бясплатнае пражыванне ў Вільні. **Харчаванне ўдзельнікаў фестываля не фінансуецца.**

toKino